8(Бел)(075в)
М-642

*Я. І. Міронччык*



# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

## ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТ.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

***Я. І. Міронч‌ык***

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX ст.

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

ААВЛ

Бібліятэка БДПУ імя М Танка

Чк 2071

Мінск 2004

УДК 821.161.3(075.8)
ББК 83.3(4Беи)я73
М641

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ
Рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 1 ад 08.01.04)

*Рэцэнзэнт* І. М. Слесарава, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры філасофіі і гуманітарных праблем адукацыі АПА

**Міронччык Я. І.**
М641 Беларуская літаратура першай паловы XX ст.: Вучэб.-метад. дапам.— Мн.: БДПУ, 2004.— 78 с.
ISBN 985-435-712-0

У дапаможніку разглядаецца гісторыя развіцця беларускай літаратуры пачатку XX ст. Матэрыял ахоплівае суадносныя вучэбныя раздзелы курса беларускай літаратуры за 10—11 класы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы і адпавядае патрабаванням праграмы для паступаючых у ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Адрасуецца вучням педагагічных класаў, абітурыентам, студэнтам, усім, хто цікавіцца беларускай літаратурай.

**УДК 821.161.3(075.8)**
**ББК 83.3(4Беи)я73**

ISBN 985-435-712-0

© Я. І. Міронччык, 2004
© ВВЦ БДПУ, 2004

## ПРАДМОВА

Новая беларуская літаратура пачынае адлік з пачатку XIX ст., калі ўжо адбыліся лёсавызначальныя падзеі для большасці народаў Еўропы. Рэвалюцыйна-дэмакратычны рух у Германіі і Францыі істотна паўплываў на далейшае развіццё не толькі заходнееўрапейскіх нацыянальных літаратур, але і рускай, беларускай, украінскай.

У папярэднім дапаможніку «Беларуская літаратура X—XIX стагоддзяў» былі разгледжаны асноўныя напрамкі развіцця шматмоўнай літаратуры Беларусі ў XIX ст., калі культываваліся такія важнейшыя творчыя метады, як сентыменталізм, рамантызм і рэалізм. Дэмакратычныя традыцыі ў беларускай літаратуры, закладзеныя У. Сыракомлем, В. Каратынскім, В. Дуніным-Марцінкевічам, Ф. Багушэвічам, Я. Лучынам і А. Гурыновічам, былі падхоплены ў асяроддзі беларускіх навукоўцаў і студэнтаў Пецярбурга і Вільні ў пачатку XX ст. У адрозненне ад пачынальнікаў, якія не былі аб'яднаны унітарнай нацыянальнай ідэяй, нашаніўцы групавалі вакол сябе аднадумцаў і аднаўлялі агульнабеларускі культурны канон, універсальны для беларусаў розных канфесіянальных арыентацый. Па гэтай прычыне газета «Наша ніва» выходзіла з друку ў дзвюх рэдакцыях — кірылічнай і лацінскай.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. паспрыяла беларускаму адраджэнню: царскі рэжым пайшоў на дэмакратычныя ўступкі і зрабіў паслабленне для беларускага друкаванага слова. Упершыню за апошнія два стагоддзі беларусы атрымалі магчымасць удзельнічаць у дэмакратычным руху краін Усходняй Еўропы. Верш Я. Купалы «А хто там ідзе?» засведчыў імкненне жыхароў нашага краю «людзьмі звацца».

Першай свядомай нацыянальнай арганізацыяй стаў «Кружок Беларускае Народнае Асветы», заснаваны ў Пецярбурзе ў 1902 г. беларускімі студэнтамі, якія дамагаліся права беларускага народа на існаванне. Намаганнямі членаў гэтай арганізацыі была створана Беларуская сацыялістычная грамада (першая беларуская партыя), у склад якой уваходзілі вядомыя пісьменнікі, культурныя і грамадскія дзеячы. Родная мова спрыяла ўкараненню сацыял-дэмакратычных ідэй, вельмі папулярных у той час ва ўсёй Еўропе. У мастацкай палітры майстроў слова дамінаваў рэалістычны вобраз беларускага селяніна, прыніжанага і прыгнечанага, абрабаванага хеўрай хцівых чыноўнікаў. Менавіта ад публіцыстыкі, жывога мастацкага слова залежаў рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Прафесар філасофіі У. Конан сцвердзіў думку, што ядром і зыходным імпульсам адраджэння была і ёсць памяць народа і яго духоўнае самавыяўленне ў роднай мове, нацыянальнай гісторыі, этнічных формах культуры, народных сімвалах і святах.

У першым дзесяцігоддзі XX ст. І. Канчэўскі і В. Ластоўскі распрацоўвалі канцэпцыю нацыянальнага стылю ў беларускай літаратуры як універсальную катэгорыю эстэтыкі. І. Канчэўскі ў філасофскім эсэ «Адвечным шляхам» узняў пытанне аб значэнні мастацтва ў жыцці народа. На яго думку, мастацтва — гэта «тварэнне чыстай формы, бесканечнае, невычарпальнае», як сама душа народа. У. Конан сцвярджае: «Тры іпастасі беларускай душы (і кожная з трагічнай падсветкай) — *лірычная, лірыка-драматычная і артыстычная* — раскрыліся адпаведна ў паэзіі Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча. Але ёсць яшчэ і таемны *драматызм і містычнасць* быцця народа, што вынікаюць з яго гістарычнага наканавання».